*М. А. БЯСПАЛАЯ*

# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ МУЗЕІ БЕЛАРУСІ: СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

*Адлюстроўваюцца вынікі даследавання, праведзенага ў межах задання «Распрацаваць навукова-метадычныя рэкамендацыі ўкаранення сучасных музеязнаўчых тэхналогій у дзейнасць рэгіянальных музеяў Беларусі» Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. Аўтар раскрывае асноўныя кірункі дзейнасці, звяртае ўвагу на магчымыя перспектывы развіцця рэгіянальных музеяў.*

Праблема вызначэння дэфініцыі «рэгіянальны музей» па-ранейшаму выклікае навуковыя дыскусіі. Міжнародны камітэт рэгіянальных музеяў, адзін з дэпартаментаў Міжнароднага савета музеяў, прапаноўвае наступную характарыстыку азначэння: «Рэгіянальныя музеі дзейнічаюць на тэрыторыях, якія характарызуюцца выразна акрэсленай геаграфічнай, гістарычнай і культурнай ідэнтычнасцю. Яны павінны ахопліваць усе аспекты мінулага, сучаснага і будучага дадзенай тэрыторыі і ствараць умовы для прадаўжэння дыялога з мясцовым насельніцтвам, вынікам якога павінны стаць своеасаблівыя ўзаемаадносіны» [гл. 3].

На наш погляд, экспазіцыі і дзейнасць айчынных рэгіянальных музеяў выразна адлюстроўваюць усе аспекты дадзенай характарыстыкі. Па-першае, самы выразны маркер самабытнасці гісторыка-культурнай спадчыны любой этнічнай групы, этнаграфічная калекцыя, у кожным рэгіянальным музеі не паўтарае калекцыю бліжэйшага суседняга музея. Тлумачэнне гэтаму відавочнаму факту трэба шукаць у асаблівасцях нашага гістарычнага мінулага. Думаецца, адна з важнейшых прычын у тым, што тэрыторыя Беларусі ніколі не была шчыльна населенай, а ў перыяд найбольш актыўнага фарміравання беларускага этнасу – XVI–XVII стст., у выніку войнаў колькасць насельніцтва паменшылася амаль напалову. Гэтыя абставіны і абумовілі пэўную абмежаванасць тэрыторый, на якіх працягваўся працэс фарміравання этнасу і замацавання мясцовых адметнасцей у традыцыйнай культуры.

Па нашым меркаванні, можна вылучыць яшчэ адну асаблівасць функцыянавання рэгіянальнай музейнай сеткі, якая звязана з геаграфічным фактарам. Вучоныя-этнографы выдзяляюць на тэрыторыі Беларусі 6 этнаграфічных рэгіёнаў – Цэнтральная Беларусь, Паазер’е, Падняпроўе, Панямонне, Заходняе і Усходняе Палессе. Адміністрацыйны падзел на вобласці ў большасці супадае з гісторыка-этнаграфічным, і кожны абласны музей выконвае ролю галаўнога ў сваім рэгіёне. Да сказанага можна дадаць, што рэгіянальная музейная сетка супадае з адміністрацыйным падзелам Рэспублікі Беларусь, і ў выніку атрымоўваецца як бы падвоены эфект накладання і супадзення адметнай гісторыка-культурнай спадчыны і яе геаграфічных межаў.

Па-другое, экспазіцыі рэгіянальных музеяў раскрываюць працэсы гістарычнага развіцця на падставе музейных прадметаў, якія характарызуюць асаблівасці канкрэтна вызначанага рэгіёна. І хаця большасць экспанатаў складаюць археалагічныя прадметы, але разам з прадметамі этнаграфіі, гістарычнымі дакументамі і іншымі яны даюць наведвальніку магчымасць выразна ўявіць мінулае сваёй малой радзімы.

Па-трэцяе, рэгіянальныя музеі з’яўляюцца часткаю мясцовага сацыякультурнага асяроддзя, таму што ажыццяўляюць актыўны дыялог з насельніцтвам, выкарыстоўваючы як традыцыйныя, так і сучасныя формы музейнай культурна-адукацыйнай работы.

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь дзейнічае каля 140 рэгіянальных музеяў – абласных, гарадскіх і раённых, якія складаюць большую частку музейнай сеткі. Адпаведна існуючай класіфікацыі 50% складаюць краязнаўчыя, 23% – гістарычныя, 13% – мастацкія, 10% – літаратурныя і 4% – іншыя музеі. Відавочна, што рост колькасці музеяў у рэспубліцы адбываецца за кошт рэгіянальных музеяў. Гэта сведчыць аб праяўленні культурнай сама-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэнтыфікацыі рэгіёнаў і адпавядае агульнасусветнай тэндэнцыі. Дзейнасць рэгіянальных музеяў дастаткова выразна адлюстроўвае спецыфіку рэгіёна. Напрыклад, для музеяў Гродзенскай вобласці характэрна правядзенне культурна-адукацыйных мерапрыемстваў з этнічнымі групамі, якія пражываюць у Беларусі, чаму спрыяе значная колькасць нацыянальна-культурных аб'яднанняў на тэрыторыі вобласці [2].

Нам падаецца, немалаважнае значэнне для ўяўлення аб дзейнасці і праблемах рэгіянальных музеяў, што дазволіла б скласці больш-менш рэальную карціну, маюць не толькі прыведзеныя характарыстыкі, але і параўнанне музеяў на падставе своеасаблівай «магутнасці» іх фондаў, актыўнасці і вынікаў культурна-адукацыйнай дзейнасці. Магчымасць для такога аналізу ствараюць наступныя крыніцы: вынікі анкетавання супрацоўнікаў рэгіянальных музеяў, непасрэднае азнаямленне з іх дзейнасцю, а таксама выкарыстанне ўсіх даступных друкаваных крыніц і электронных рэсурсаў.

Разам з тым мы павінны звярнуць увагу, што больш за палову рэгіянальных музеяў (57%), як паказана на дыяграме, складаюць музеі, якія маюць у фондах да 10 тыс. адзінак захавання. Самыя нязначныя фонды мае Ганцавіцкі раённы краязнаўчы музей. Да буйных музеяў, якія захоўваюць у фондах больш за 50 тыс. музейных прадметаў, належаць 6 абласных галаўных музеяў, «Музей Беларускага Палесся» г. Пінска.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Рэгіянальныя музеі**
**па колькасці адзінак захавання**[1]
(агульная колькасць музеяў -- 142)




Аднак, як паказала наша даследаванне, актыўнасць усіх кірункаў музейнай дзейнасці, значнасць у сацыякультурным жыцці рэгіёна не залежаць ад памераў музейных фондаў, а, у першую чаргу, ад інтэлектуальнага і крэатыўнага патэнцыялу музейных супрацоўнікаў.

Залогам паспяховай дзейнасці любога музея з'яўляюцца кадры, іх высокая прафесійная падрыхтоўка, крэатыўны падыход да даручанай справы.

Не такім адназначным з'яўляецца пытанне аб сутнасці музейнай спецыяльнасці, і погляды большасці музейных работнікаў супадаюць з падыходам, прынятым у сусветнай музейнай практыцы: музейны супрацоўнік павінен быць спецыялістам у пэўнай галіне ведаў, і толькі пасля працяглай адаптацыі ў музейным асяроддзі з яго можа атрымацца высокакласны спецыяліст. Да апошняга часу іншая думка не з'яўлялася папулярнай, аднак развіццё тэорыі музейнай справы, навуковыя і практычныя распрацоўкі ў гэтай галіне стварылі неабходны падмурак для пераасэнсавання стэрэатыпных поглядаў на асобу музейнага спецыяліста, яго ўменні і навыкі.

Праца ў музеі патрабуе глыбокіх і дасканалых ведаў, перш за ўсё ў профільнай дысцыпліне. Па звестках Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь 82% музейных супрацоўнікаў маюць вышэйшую адукацыю, у рэгіёнах гэты паказчык адпавядае 77%, профільную адукацыю маюць 56%, а музеязнаўчую 10%. Такая сітуацыя не дазваляе весці размову аб завяршэнні фарміравання айчыннай музеялагічнай школы, нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці музейных высокапрафесійных практыкаў. Працэс толькі разгортваецца. У рэгіянальных музеях, як і ў сталічных, існуе неабходнасць у забеспячэнні новых сфер музейнай дзейнасці, і супрацоўнікі рэгіянальных музеяў разумеюць неабходнасць паглыблення спецыялізацыі, аб чым выразна сведчаць адказы на пытанні анкеты. Тым самым неабходна прызнаць, што працэс кадравага забеспячэння рэгіянальных музеяў напрамую звязаны з удасканаленнем падрыхтоўкі музейных спецыялістаў, у прыватнасці з дзейнасцю кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, і перападрыхтоўкай музейных кадраў у сістэме Міністэрства культуры.

На працягу многіх дзесяцігоддзяў галоўнай задачай музейнай дзейнасці прызнавалася дакументаванне гісторыка-культурнай спадчыны музейнымі сродкамі, аднак з працэсам актыўнага ўключэння музея ў сацыякультурнае асяроддзе мяняецца ўяўленне аб яго задачах. Тым не менш захаванне і папаўненне фондаў, апрацоўка музейных прадметаў

[1] Дыяграма складзена на падставе даных : Музеі Беларусі : давед. выд. – Мінск : БелЭн, 2008. – 559 с. ; Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2010 / І. В. Анціпенка [і інш.]; пад агул. рэд. Т. І. Стружэцкага ; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі. – Мінск, 2011. – С. 35–37.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

застаецца па-ранейшаму важнейшай функцыяй музея. Аб гэтым сведчыць распрацоўка і ўдасканаленне заканадаўчай базы, якая мае прамое дачыненне да музеяў і музейнага фонду Рэспублікі Беларусь і рэгулюе яго камплектаванне. Згодна з афіцыйнымі данымі ў фондах рэгіянальных музеяў захоўваецца каля 2,4 млн музейных прадметаў, аднак іх штогадовы прырост складае толькі 1,8% (49 099 адзінак). Адной з галоўных прычын гэтага з'яўляецца недастатковае фінансаванне дадзенага кірунку музейнай дзейнасці. У большасці выпадкаў камплектаванне фондаў адбываецца за кошт дабрачынных ахвяраванняў. Не выпадкова ў некаторых рэгіянальных музеях, напрыклад Лепельскім краязнаўчым музеі, праводзіцца раённы конкурс «Лепшы падарунак для музея».

Другой праблемай фондавай дзейнасці можна лічыць стварэнне належных умоў для захавання музейных прадметаў праз набыццё спецыяльнага абсталявання для фондасховішч, сістэм забеспячэння захаванасці. З рэгіянальных музеяў такая сістэма ёсць у Мінскім абласным краязнаўчым музеі г. Маладзечна.

У апошнія гады адной з важнейшых задач, што стаіць перад супрацоўнікамі музеяў, з'яўляецца стварэнне электроннай базы даных асноўнага музейнага фонду і ўнясенне найбольш каштоўных музейных прадметаў у Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Аднак, як адзначана ў дакладзе Міністра культуры Рэспублікі Беларусь на выніковай калегіі Міністэрства культуры 8 лютага 2012 г., падача музеямі звестак адбываецца досыць марудна. На гэты час у Дзяржкаталогу зарэгістравана толькі 27 137 апісанняў.

У выкананні гэтай задачы выразна праяўляюцца дзве праблемы, па-першае, недастатковае абсталяванне рэгіянальных музеяў камп'ютарнай тэхнікай, у 69 рэгіянальных музеях не ўстаноўлена праграмнае забеспячэнне, а па-другое, крытэрыі тых уласцівасцей, якія дазваляюць уносіць музейны прадмет у Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь (паколькі інфармацыя аб кожным музейным прадмеце павінна быць прадстаўлена па 20 пазіцыях і на трох мовах), дакладна не вызначаны. На думку музейных спецыялістаў, з 3 млн музейных прадметаў, якія захоўваюцца ў фондах музеяў рэспублікі, да каштоўных, гэта значыць тых, якія можна лічыць нацыянальным здабыткам, можна аднесці каля 1 млн. Аднак, як сведчаць вынікі анкетавання навуковых супрацоўнікаў, на месцах існуюць цяжкасці ў вызначэнні адпаведнасці музейнага прадмета нацыянальнаму ўзроўню, нягледзячы на тое, што гэтыя характарыстыкі абмяркоўваюцца на музейных закупачных і экспертнай камісіях пры Міністэрстве культуры.

Сучасная музеялогія разглядае музей як сацыякультурны інстытут, які займае сваю нішу ў сацыякультурным асяроддзі, і галоўным маркерам гэтага з'яўляецца яго культурна-адукацыйная дзейнасць. Да месца будзе сказаць, што перамены ў назве гэтай формы музейнай дзейнасці выяўляюць эвалюцыю розных пунктаў гледжання на музей і яго месца ў грамадстве. На кожным этапе свайго існавання музей набываў новыя якасці, якія адлюстроўвалі запыты тагачаснага грамадства, удасканальваў формы працы з наведвальнікамі. Калі музей разглядаўся галоўным чынам як навуковая ўстанова, то і праца з яго наведвальнікамі атрымала назву навукова-асветніцкая, калі музеі сталі часткаю палітыка-асветных устаноў, то і работа з наведвальнікамі называлася палітыка-асветніцкай.

У апошнія дзесяцігоддзі распаўсюдзіўся падыход да асноўнай функцыі музея як да сацыяльнай функцыі выхавання і адукацыі, якая грунтуецца на прынцыпах музейнай педагогікі і рэалізуецца ў разнастайных формах экспазіцыйна-выставачнай і экскурсійнай практыкі, а таксама праз неэкспазіцыйныя формы ўзаемадзеяння з наведвальнікамі, напрыклад: удзел музея ў разнастайных мерапрыемствах і праектах, супрацоўніцтва з іншымі сацыякультурнымі ўстановамі і інш.

Развіццё новых форм культурна-адукацыйнай дзейнасці звязана з усведамленнем музея як сацыякультурнага цэнтра з самымі шырокімі функцыямі, што абумовіла пераход да выкарыстання музеямі комплексных культурна-адукацыйных форм, якія прадугледжваюць актыўны ўдзел наведвальнікаў у музейных мерапрыемствах. У гэтым працэсе выкарыстоўваюцца і традыцыйныя формы музейнай дзейнасці з ужываннем сучасных гульнёвых мадэлей – тэатралізаваных, інтэрактыўных.

Амаль любы рэгіянальны музей практыкуе спалучэнне традыцыйнай формы культурна-асветніцкай дзейнасці з інтэрактыўнымі метадамі трансляцыі гісторыка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай спадчыны. У якасці ілюстрацыі выкарыстаем, напрыклад, выставу ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі «Беларускі ручнік: з глыбіні стагоддзяў». Экскурсія па ёй прадугледжвала ўключэнне інтэрактыўных элементаў: можна назіраць за працай на кроснах ці сесці за кросны і паспрабаваць тэхніку ткацтва. Выстава была вельмі цёпла сустрэта наведвальнікамі, якія дзяліліся ўражаннямі на старонках кнігі водгукаў: «Цудоўная экспазіцыя навявае ўспаміны мінулага, аб дзядулях і бабулях, аб сваіх каранях», «Вельмі цікава апынуцца ў пару нашых дзядоў і прадзедаў, чым жылі, тым больш у наш век тэхнічнага прагрэсу» і інш. Сучасныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці не заўсёды прывязаны да экспазіцыі (музейныя ўрокі ці лекцыі ў школе, фестывалі, святы і інш.).

Адным з цікавых прыкладаў можна лічыць такую сучасную форму, як «Ноч музеяў», якую сталі выкарыстоўваць і рэгіянальныя музеі. Напрыклад, Вілейскі краязнаўчы музей у 2010 і 2011 гг. арганізаваў правядзенне «Ночы музеяў» як вялікі маштабны фестываль пад адкрытым небам, дзе, акрамя наведвання музея і выставачнай залы, гледачы маглі паўдзельнічаць у тэатралізаваных гістарычных падзеях, флэш-мобах, паглядзець вогненнае шоу, выступленні беларускіх зорак, сучасных музыкантаў з высокай якасцю гуку і святла. Такія фестывалі прайшлі ўжо двойчы і сталі па-сапраўднаму падзеямі года, тым больш, што колькасць наведвальнікаў у некалькі тысяч гаворыць сама за сябе.

На прыкладзе плана падрыхтоўкі і правядзення «Ночы музеяў» у Вілейцы можна скласці ўяўленне аб тым, які вялікі аб'ём працы неабходна ажыццявіць: задзейнічаць амаль усе раённыя структуры, прадумаць шмат дэталяў – ад распрацоўкі сцэнарыя, рэкламных афіш, размяшчэння рэкламы ў СМІ, устаноўкі экранаў, апаратуры, забеспячэння грамадскага парадку, санітарна-гігіенічных патрабаванняў, запрашэння музычных калектываў і асобных выканаўцаў да арганізацыі медыцынскага суправаджэння і пажарнай бяспекі. Відавочна, што «Ноч музеяў» ператвараецца ў сацыякультурную падзею раённага маштабу і музей выступае як яе ініцыятыўны, крэатыўны і каардынацыйны цэнтр. Асаблівае ўражанне выклікала гісторыка-тэатралізаваная частка мерапрыемства «Ноч музеяў – 2011», якая адлюстроўвала мінулае Вілейшчыны – ад першабытнага грамадства да сучаснасці [1].

Рэгіянальнымі музеямі рэалізуюцца значныя міжнародныя праекты. У якасці выразнага прыкладу выкарыстаем дзейнасць Капыльскага краязнаўчага музея, зусім не багатага на музейныя прадметы, але багатага на таленавітых людзей. Супрацоўнікі музея ў 2010 г. удзельнічалі ў двух інавацыйных праектах. Першы – праект праграмы развіцця ААН (праграма Еўрапейскай Камісіі «Падтрымка навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь»). Ініцыятыва музея – стварэнне зялёнага маршруту «Міжрэчча Мажы і Марачы» ў Семежаўскім сельскім савеце. У выніку былі выпушчаны брашура «Міжрэчча Мажы і Марачы», буклеты «Вястунка Бога» і «Мядовае царства», уладкаваны інфармацыйнымі шчытамі пчальнікі, гідралагічны заказнік «Марач», Семежаўскі водаканал, а таксама распрацаваны турыстычны маршрут.

Другі праект «Уклад у сусветную культуру ўраджэнцаў Капыльшчыны, якія імігрыравалі ў пачатку XX ст.» сумесна з таварыствам з ФРГ, па выніках якога была выдадзена брашура «Навекі застацца сваю захаваўшы». Сабраны матэрыял выкарыстаны для экспазіцыі і перасовачнай выставы на трансформерах, што дапамагае даехаць да самых аддаленых вёсак рэгіёна. За ажыццяўленне праекта атрыманы дыплом.

Пры аналізе экспазіцый многіх рэгіянальных музеяў ствараецца ўражанне аб перавагах традыцыйных калекцыйнага і тэматычнага паказаў. Стандартнае афармленне перыяду 1980-х гг. усё яшчэ можна ўбачыць у многіх рэгіянальных музеях рэспублікі. Такая сітуацыя не адпавядае ўзроўню інфармацыйных патрэб сучаснага наведвальніка, хаця неабходна прызнаць, што экспазіцыі многіх рэгіянальных музеяў захоўваюць шмат найкаштоўнейшых дакументаў і экспанатаў, якія могуць задаволіць інтэлектуальны інтарэс наведвальнікаў. На наш погляд, дыскусійным з'яўляецца пытанне аб апраўданасці запатрабаванняў сучаснага наведвальніка і дакладнага іх прытрымлівання.

Каб адказаць на гэтае пытанне, неабходна мець доказную базу, якую маглі б стварыць адпаведныя сацыялагічныя даследаванні, што праводзіліся ў музеях Беларусі 10 гадоў назад. Таму дакладна вызначыць, *што* трэба адказаць на запыт сучаснай аўдыторыі, амаль немагчыма. Як сведчаць сацыялагічныя даследаванні, у музеях блізкага замежжа,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

напрыклад у Траццякоўскай галерэі, наведвальнікі перш за ўсё чакаюць ад музея паглыблення эмацыянальных пачуццяў, уяўленняў, вопыту, каб запоўніць рафінаваную пустэчу інфармацыйнага грамадства.

Гэта адзін бок працэсу, а другі, на думку даследчыкаў, заключаецца ў тым, што людзі паступова губляюць свае карані і застаюцца з абрыўкамі культурных кантактаў, таму імкнуцца адшукаць патрэбную інфармацыю ў музейнай экспазіцыі. На праблеме паступовай страты гісторыка-культурнай ідэнтычнасці хацелася б спыніцца, таму што, на наш погляд, гэты працэс у Беларусі яшчэ не набыў неабарачальны характар, у чым важную ролю якраз выконваюць рэгіянальныя музеі. Іх разнастайная дзейнасць па захаванні і трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны ўплывае на сацыякультурную сітуацыю, тым больш, што ў рэгіёнах яшчэ дастаткова актыўна дзейнічаюць носьбіты культурных здабыткаў беларускага народа.

Да месца будзе невялічкая заўвага: сучаснага музейнага наведвальніка аддзяляе ад гістарычнага мінулага, якое захоўваецца і трансліруецца музеем, не так і многа – каля паўстагоддзя, фактычна гэта пакаленне сучасных 40-гадовых бацькоў і іх дзяцей, таму што многія 60-гадовыя бабулі і дзядулі не толькі шмат памятаюць з мінулага, але захавалі і могуць перадаць некаторыя здабыткі нашай гісторыка-культурнай спадчыны.

Перад сучаснай экспазіцыяй ставяцца самыя разнастайныя задачы: яна павінна ўяўляць мастацка арганізаваную прастору, здольную ўступаць у дыялог з наведвальнікам, даваць веды і ўзбагачаць уяўленне гледача яркімі і атрактыўнымі вобразамі, а не толькі адлюстроўваць асобныя гісторыка-культурныя падзеі. Згодна з сучаснай трактоўкай экспанат валодае меншай каштоўнасцю, чым яго кантэкст, варыянты яго інтэрпрэтацыі. Па нашым меркаванні, выразна адчуваюцца арыентацыя на запыты сучаснага наведвальніка і перамяшчэнне на другі план традыцыйнага погляду на музейную экспазіцыю. Досыць рэльефна праяўляюцца тэндэнцыі, якія вызначаюць магчымыя шляхі ўдасканалення сучаснай музейнай экспазіцыі і яе камунікатыўнага патэнцыялу, і перш за ўсё, гэта імкненне да актыўнага выкарыстання навацый у сферы тэхнічнага забеспячэння і дасягненняў экспазіцыйнага дызайну, накіраванага на ўжыванне разнастайных вобразна-выразных сродкаў пры арганізацыі экспазіцыйнага асяроддзя. Выкарыстанне ў экспазіцыйнай прасторы камп’ютарнай тэхнікі стварае атмасферу віртуальнасці, якая пашырае «гульнёвую прастору» музея.

Адной з важнейшых задач рэгіянальных музеяў з’яўляецца вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны. Гэты кірунак музейнай дзейнасці патрабуе дэталёвага аналізу і сістэматызацыі, мы ж акрэслім некаторыя моманты. Выкарыстаная эмпірычная база дазваляе зрабіць выснову, што ў музеях краіны ажыццяўляюцца разнастайныя даследаванні гісторыка-культурнай спадчыны, праблем яе захавання і трансляцыі. У навукова-даследчай рабоце рэгіянальных музеяў вельмі выразна праяўляецца так званы чалавечы фактар, таму што пастаянна займацца гэтым відам дзейнасці здольны толькі адзінкі. Часцей за ўсё з мясцовых музейшчыкаў, настаўнікаў, краязнаўцаў фарміруецца група апантаных людзей, за якімі ідуць іншыя. Напрыклад, такім чынам развіваліся падзеі ў Нароўлі, дзе па ініцыятыве настаўніка В. Чайкі пачалі ладзіцца экспедыцыі як у жылыя, так і ў адселеныя вёскі. У перыяд з 2004 па 2010 г. было здзейснена каля 70 краязнаўчых экспедыцый па тэрыторыі Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка з мэтай пошуку матэрыялаў для экспазіцыі і правядзення фотафіксацыі элементаў народнай архітэктуры.

Навуковыя даследаванні гісторыка-культурнай спадчыны ў рэгіянальных музеях можна пэўным чынам сістэматызаваць па відах, як, напрыклад, арганізацыя выстаў на тэму «Гісторыка-культурныя каштоўнасці раёна» ці «Лепшыя знаходкі мінулага года». У Лідскім гісторыка-мастацкім музеі адбылася рэдкая для беларускіх музеяў выстава аднаго прадмета пад назвай «След вікінга», на якой дэманстраваўся фрагмент наканечніка скандынаўскага мяча IX ст. У многіх музеях мелі месца навуковыя чытанні і канферэнцыі. Можна адзначыць канферэнцыі «Да 95-годдзя Першай сусветнай вайны» ў Вілейскім і Смаргонскім музеях, «Наваградскія чытанні». Як асобы від навукова-даследчай дзейнасці рэгіянальных музеяў можна разглядаць выданне брашур, буклетаў, паштовак, прысвечаных мясцовым музеям і гістарычным памятным мясцінам, культурным каштоўнасцям; віктарыны для вучняў на мясцовым матэрыяле. Важнае месца займаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выступленні ў друку, на радыё і тэлебачанні. Так, са студзеня 2011 г. у газеце «Гомельская праўда» вядзецца пастаянная рубрыка «Музеі Гомельшчыны».

На падставе навуковых даследаванняў рэгіянальных музеяў напісаны многія артыкулы, у тым ліку для БелСЭ, кніг «Памяць», гісторыка-краязнаўчыя ці гісторыка-эканамічныя нарысы, напрыклад: «Барысаў. Гісторыка-эканамічны нарыс», «Барысаў і яго ваколіцы», «Гісторыя пажарнай службы Ганцавіцкага раёна» і інш.

У рэгіянальных музеях працуюць над складаннем рэестра гістарычных і памятных мясцін рэгіёна, картатэк народных легенд і паданняў, стварэннем фільмаў цыкла «Малая радзіма» (Лагойскі і Вілейскі музеі), краязнаўчых інтэрнэт-сайтаў, распрацоўкай экскурсійных маршрутаў.

Аналіз навуковай дзейнасці рэгіянальных музеяў паказвае дастаткова шырокую яе разнастайнасць. Праца ажыццяўляецца каласальная, аднак звесткі аб ёй рэдка выходзяць за межы рэгіёна, ды і навуковае асэнсаванне гэтай патрэбнай і карыснай дзейнасці сёння адсутнічае. Тое ж самае можна сказаць і аб навуковым даследаванні музейных калекцый, якія захоўваюцца ў фондах рэгіянальных музеяў і чакаюць сваіх даследчыкаў.

Падводзячы вынік сказанаму, неабходна засяродзіць увагу на асноўных праблемах рэгіянальных музеяў. На наш погляд, іх можна аб'яднаць у дзве групы, першая з якіх датычыцца агульнатэарэтычных пытанняў развіцця музеяў – вызначэнне іх ролі і месца ў сацыякультурным асяроддзі, распрацоўка і ўжыванне сучасных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці ў справе трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны, арыентацыя на сучасныя тэндэнцыі ў экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці; другая ўключае праблемы забеспячэння практычнага боку дзейнасці рэгіянальных музеяў, неабходнасць удасканалення існуючага заканадаўства, аптымальнае забеспячэнне камп'ютарнай тэхнікай і далучэнне да сучасных музейных тэхналогій, стварэнне належных умоў захавання і аховы музейных прадметаў, паляпшэнне фінансавання. Мы лічым, што гэтыя праблемныя групы аб'ядноўвае агульная праблема – кадравая, без вырашэння якой немагчыма пазбавіцца і ад большасці праблем у дзейнасці рэгіянальных музеяў. Дарэчы, на кадравую праблему як галоўную звярталі ўвагу супрацоўнікі музеяў у анкетах і падчас апытання.

Шляхі вырашэння гэтых праблем разнастайныя, таму што адны з іх могуць быць ліквідаваны на дзяржаўным узроўні, другія – на рэгіянальным, а іншыя – на падставе крэатыўнага стаўлення музейных супрацоўнікаў да справы. Урэшце рэшт ніхто не можа аспрэчваць, што значнасць музея і яго дзейнасці складаецца з музейнай калекцыі, ведаў і крэатыўнасці супрацоўнікаў.


1. *Ганчар, С. М.* Роля і значэнне краязнаўчага музея ў культурным жыцці рэгіёна / С. М. Ганчар // Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь: стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 24 ліст. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 39–42.

2. *Нароўская, А. М.* Тэндэнцыі і праекты культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў Гродзенскай вобласці / А. М. Нароўская // Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь: стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 24 ліст. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М.А.Бяспалая (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ. – С. 94–100.

3. *Цилага, Е. М.* О некоторых аспектах организации региональных музеев в Греции / Е. М. Цилага [и др.] // Музеология – музееведение в XXI веке : проблемы изучения и преподавания : материалы Междунар. науч. конф., Санкт-Петербург, 14–16 мая 2008 г. / отв. ред. А. В. Майоров. – СПб. : Изд-во СПбГУ, 2009. – С. 110–120.



*M. BYASPALAYA*


**REGIONAL MUSEUMS OF BELARUS:
MODERN STATE AND PERSPECTIVES OF DEVELOPMENT**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

The article reflects the results of the research made in the network of the task «to work out the scientific and methodic recommendations of the modern museological technologies' establishment in the activity of the regional museums of Belarus» of the State programme "Culture of Belarus" for 2011-2015. The author opens the main directions of the activity, pays attention to the possible perspectives of the regional museums' development.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 27.02.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ